ISSN 2414—9489. МОВА. 2016. № 26

УДК 811.161.3’42:303.732.3(045)

**БАРЫСЕНКА Вольга Уладзіміраўна,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта; вул. Захарава, 21, г. Мінск, 220034, Беларусь;
тэл.: +375 293903431; e-mail: olga.volga1964@gmail.com; ORCID ID: 0000–0002–7258–1014

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І КУЛЬТУРА: ПРАЦА З ТЭКСТАМ НА ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАХ

**Анатацыя.** ***Мэта*** артыкула — прадэманстраваць метады і прыёмы працы з тэкстам на вучэбных занятках па беларускай мове як замежнай. Галоўным стымулам чытання для замежнага навучэнца з’яўляецца пазнавальны інтарэс, імкненне праз беларускую літаратуру атрымаць веды пра краіну, пра жыццё народа — носьбіта мовы. ***Прадметам*** разгляду з’яўляецца методыка працы з тэкстам на вучэбных занятках па беларускай мове як замежнай. ***Вынікам*** вывучэння дадзенай праблемы стала распрацоўка канцэпцыі выкладання беларускай мовы як замежнай, якая мае камунікатыўную скіраванасць навучання, асноўнай адзінкай гэтай канцэпцыі з’яўляецца тэкст. ***Вывады.*** Выкладанне мовы не магчымае без вывучэння звязных тэкстаў. Дасканалае валоданне мовай азначае ўменне чытаць, слухаць і разумець аўтэнтычныя творы розных стыляў. Менавіта праца з аўтэнтычнымі тэкстамі спрыяе дасягненню асноўнай мэты вывучэння беларускай мовы як замежнай — прадукаванню ўласных тэкстаў, гэта значыць, фарміраванню звязнага спантаннага маўлення навучэнцаў. Вывучаючы граматычную тэму, навучэнец павінен разумець перспектыву выкарыстання яе ў камунікацыі, што і забяспечвае матывацыю вучэбнай дзейнасці. ***Практычнае прымяненне*** вынікаў даследавання бачыцца ў аптымізацыі навучальнага працэсу беларускай мовы як замежнай.
**Ключавыя словы:** камунікацыя, аўтэнтычны і адаптаваны тэкст, мова, культура, сацыякультурная кампетэнцыя.

Чытанне — адзін з самых распаўсюджаных відаў чалавечай дзейнасці, яно не перастае адыгрываць вялікую ролю ў сучасным грамадстве, насычаным разнастайнай інфармацыяй. С. М. Плотнікаў лічыць, што чытанне ўвогуле захоўвае культуру, што гэта тэхналогія інтэлектуальнага ўзнаўлення ў грамадстве. Гэта камунікатыўны пасярэднік, жывы дыялог з сучаснікамі і продкамі. [5, с. 9] Выкладанне мовы не магчымае без вывучэння звязных тэкстаў. У сувязі з гэтым, вывучэнне праблем, звязаных з працай з тэкстам на вучэбных занятках па беларускай мове як замежнай з’яўляецца актуальным. На думку Е. І. Пасава, чалавек чытае, каб «задаволіць свае патрабаванні: а) даведацца пра што-небудзь новае, цікавае; б) навесці даведкі, праверыць даныя, пераканацца ў чыёйсьці (сваёй) думцы; в) атрымаць дадатковыя звесткі пра што-небудзь; г) вывучыць штосьці грунтоўна; д) азнаёміцца з чымсьці, атрымаць агульнае ўяўленне пра прадмет зацікаўлення; е) пазабавіцца; ж) атрымаць інфармацыю пра пра той прадмет, пра які няёмка не ведаць («пытанне прэстыжу»); з) задаволіць інтарэс да чытання як да працэсу (эстэтычнае задавальненне); і) прабавіць час. Задавальняючы свае жаданні, свае інтарэсы, чалавек тым самым уздзейнічае на сябе праз кнігу, праз іншага чалавека» [4, с. 60–61]. Акрамя гэтага, чытанне традыцыйна разглядаецца як працэс прыёму і перапрацоўкі інфармацыі, і пад інфармацыяй разумеецца змест тэксту. Па словах А. А. Вейзэ, мэта чытання складаецца з атрымання і перапрацоўкі інфармацыі, якая змяшчаецца ў тэксце [2, с. 15].

Такім чынам, задачы навучання чытанню як самастойнаму віду маўленчай дзейнасці заключаюцца ў тым, каб навучыць здабываць інфармацыю з тэксту ў аб’ёме, неабходным для вырашэння пэўных маўленчых задач. У адпаведнасці з гэтай устаноўкай складзена класіфікацыя чытання па відах: праглядавае, азнаямленчае, вывучальнае.

На сённяшні момант лінгвістыка налічвае нямала азначэнняў «тэксту». М. Р. Гальперын, напрыклад, сцвярджае, што тэкстам счытваецца вытворчасць маўленчатворчага працэсу, які валодае завершанасцю, аб’ектываваны ў выглядзе пісьмовага дакумента і складаецца з назвы (загалоўка) і шэрагу асаблівых адзінак (звсрхфразавых адзінстваў), аб’яднаных рознымі тыпамі лексічнай, граматычнай, лагічнай, стылістычнай сувязі з акрэсленай скіраванасцю і прагматычнай устаноўкай [3, с. 82]. Тэкст можна разглядаць і як дыдактычную адзінку навучальнага працэсу, і як об’ект адукацыі, і як універсальную матывацыйную крыніцу навучання замежнай мове. У гэтай сувязі тэкст паўстае аўтэнтычным фрагментам культурна-моўнай прасторы. Каштоўнасць тэксту як адзінкі навучання не абмяжоўваецца яго сацыякультурным напаўненнем. Праца з тэкстам на вучэбных занятках вырашае комплекс праблем міжмоўнага ўзаемадзеяння. Тэкст задавальняе асасбістыя інтарэсы навучэнцаў, бо з’яўляецца носьбітам інфармацыі на розныя тэмы. Праца з тэкстам стымулюе гаварэнне на беларускай мове, выяўленне ўласнага пункту гледжання замежных навучэнцаў. Тэкст падае моўны камунікатыўны ўзор, адлюстроўвае спецыфіку мыслення беларусаў.

© Барысенка В. У., 2016

Для матывавання вучэбна-пазнавальнай дзейнасці выкарыстоўваюцца перадтэкстававыя і паслятэкстававыя практыкаванні. Перад чытаннем прапануецца антыцыпацыя па назве тэкту, запаўненне асацыяграмы па тэме тэкту, прапанаванне гіпотэз да ілюстрацый, складанне дыяграмы сувязяў па зададзеных словах з тэксту. На паслятэкставым этапе выкарыстоўваюцца заданні на змену жанру аповеду, змену перспектыў дзеяння, сачыненне перадгісторыі, напісанне лістоў героям аповеду, інсцыніраванне дыялогаў.

У апошні час методыка выкладання замежнай мовы надае вялікае значэнне праблеме аўтэнтычнасці. Праблемай аўтэнтычных матэрыялаў і іх выкарыстання пры навучанні замежнай мове займаліся і працягваюць займацца многія вучоныя-метадысты, як айчынныя, так і замежныя (А. Насовіч, Р. Мільруд, Г. Вароніна, Н. Ялухіна, Г. Рогава, J. Harmer, M. Breen, L. Lier, D. Wilkins і многія іншыя). Неаўтэнтычная, ці вучэбныя, тэксты — гэта тэксты, напісаныя спецыяльна для выкарыстання ў вучэбным працэсе. Пры іх дапамозе замацоўваецца граматычны ці лексічны матэрыял. Аўтэнтычныя — гэта тэксты, якія першапачаткова не былі прыстасаваныя для вучэбных мэтаў, яны напісаны носьбітамі мовы для носьбітаў мовы. Гэтыя тэксты выконваюць пэўны сацыяльны заказ пры вывучэнні мовы, хаця і не створаны спецыяльна для навучэнцаў. Такую ролю могуць выконваць газетныя ці часопісныя артыкулы, радыёперадачы, рэкламныя аб'явы і, натуральна, мастацкія тэксты. Менавіта праца з аўтэнтычнымі тэкстамі спрыяе дасягненню асноўнай мэты вывучэння замежнай мове — «прадукаванню ўласных тэкстаў, гэта значыць, фарміраванню звязнага спантаннага маўлення навучэнцаў. Усебаковае выкарыстанне тэксту і яго шматаспектны аналіз, як сцвярджаюць метадысты,– найбольш кароткі і эфектыўны шлях моўнага навучання» [6, с. 203]. Такім чынам, функцыя тэксту ў вучэбным працэсе — быць і сродкам, і мэтай навучання.

Яшчэ ў 70-я гады XX ст. Савет Еўропы прапанаваў удасканаліць сістэму навучання замежным мовам. Асноўным падаходам быў прызнаны камунікатыўны сістэмна-дзейны падыход. «Нядзіўна, што дыдактычнай парадыгмай на сучасным этапе агульнапрызнана камунікатыўнае навучанне, арыентаванае на такую арганізацыю адукацыйнага працэсу, якая ўзнаўляе ўсе неабходныя ўмовы рэальнага кантактавання сродкамі вывучаемай замежнай мовы адэкватна працэсу камунікацыі, абмену інфармацыяй» [1, с. 3].

У 1992 г. у Беларусі была выпрацавана новая канцэпцыя школьнай моўнай адукацыі. Новыя пакаленні падручнікаў па рускай, беларускай мовах як родных і па замежных мовах маюць камунікатыўную скіраванасць навучання. Яна адлюстроўвае новую стратэгію навучання: камунікатыўная задача — значэнне — форма, што стасуецца з фазай прадукцыі. Асноўнай адзінкай навучання выступае тэкст. Вывучаючы граматычную тэму, навучэнец павінен разумець перспектыву выкарыстання яе ў камунікацыі, што і забяспечвае матывацыю вучэбнай дзейнасці.

Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай зусім нядаўна паўстала як самастойная галіна айчыннай навукі. Натуральна, яна абапіраецца на дасягненні методыкі выкладання беларускай мовы як роднай, методыкі выкладання замежнай мовы і рускай мовы як замежнай.

Навучанне мове пачынаецца на падставе неаўтэнтычных тэкстаў, створаных спецыяльна для пэўных падручнікаў і дапаможнікаў. Яны пазбаўлены ад граматычных і лексічных цяжкасцяў і насычаны неабходнымі на пэўным этапе навучання адзінкамі мовы. У такіх тэкстах марфолага-сінтаксічныя і лексіка-граматычныя канструкцыі паўстаюць у іх натуральным атачэнні, выступаюць у якасці ўзору маналагічнага і дыялагічнага маўлення, служаць асновай для пабудовы самастойных выказванняў. Ужо з першых заняткаў па беларускай мове як замежнай навучанне будуецца на падставе дыялогаў.

На другім этапе навучэнцы пераходзяць да чытання і праслухоўвання адаптаваных аўтэнтычных тэкстаў. Адаптацыя можа ісці рознымі шляхамі: спрашчэнне, складанне каментараў, пераклад на родную мову навучэнцаў асобных слоў, выразаў ці ўсяго тэксту.

На трэцім этапе пераходзяць да арыгінальных аўтэнтычных тэкстаў.

Мастацкая літаратура — гэта перадусім тэксты, якія патрабуюць уважлівага прачытання, асэнсавання, інтэрпрэтацыі, герменеўтычнай практыкі, кампаратывістыкі, крэатыўнасці. І гэты працэс вымагае эўрыстычных падыходаў. У лінгвістычным аспекце беларускія аўтэнтычныя тэксты характарызуюцца разнастайнасцю лексікі, наяўнасцю слоў з эмацыйнай афарбоўкай, словазлучэнняў, разлічаных на ўзнікненне пэўных асацыятыўных сувязяў, фразеалагізмаў, «модных» слоў, слэнгу, жарганізмаў. На марфалагічным ўзроўні такім тэкстам уласціва выкарыстанне займеннікаў, формаў назоўнікаў з варыянтнымі канчаткамі, першай і другой асобы дзеясловаў, часціц, выклічнікаў. На сінтаксічным узроўні таксама адзначаецца асаблівасць — гэта кароткія неразвітыя сказы, фрагментарнасць, структурна залежныя сказы могуць ужывацца самастойна, недавыказанасць, абрыў пачатага сказа. Соцыякультурны фон рэалізуецца праз прадуктыўны слоўнікавы запас, ацэначную лексіку для выражэння ўласнай думкі, размоўныя клішэ, фонавую і безэквівалентную лексіку. У псіхалагічным аспекце такія тэксты адлюстроўваюць натуральную структуру маўлення. Тэкст выступае, з аднаго буку, як прадукт гаворкі і з'яўляецца спосабам маўленчага ўздзеяння на чытача, з другога боку, ён

выступае як аб’ект сэнсавай апрацоўкі і стварае неабходны змест і камунікатыўную базу для развіцця гаварэння.

Важную ролю ў дасягненні аўтэнтычнасці ўспрыняцця тэксту адыгрывае і яго афармленне. У сучасных падручніках, напрыклад, аб’ява падаецца ў выглядзе аркуша паперы, прымацаванага кнопкай да сцяны, артыкул — у выглядзе выразкі з газеты і г. д. Усё гэта стварае ўражанне арыгінальнасці тэксту. Аўтэнтычнасць структуры, зместу і афармлення тэкстаў садзейнічае павышэнню матывацыі навучэнцаў і фарміруе ўмовы для найбольш эфектыўнага пагружэння ў моўнае асяроддзе на ўроку.

Мастацкія аўтэнтычныя тэксты ўяўляюць асобую складанасць для замежнікаў. Каб зразумець такі тэкст, навучэнец павінен не толькі валодаць беларускай мовай, але і арыентавацца ў беларускай рэчаіснасці, культуры, гісторыі. Мастацкая вобразнасць таксама ўяўляе складанасць для замежнага студэнта: моўныя адзінкі набываюць новыя сэнсы, дадатковыя семантычныя фрагменты. З аднаго боку, дзякуючы вобразнасці мастацкі тэкст валодае вялікай колькасцю схаванай інфармацыі. З другога боку, у замежнага студэнта не хапае навыку атрымання гэтай інфармацыі, адсюль праблемы з разуменнем сэнсу мастацкага твору. Задача выкладчыка навучыць студэнта бачыць ў словах схаваны сэнс, убачыць той патэнцыял, які ў іх закладзены аўтарам.

Галоўным стымулам чытання з’яўляецца пазнавальны інтарэс: імкненне праз беларускую літаратуру атрымаць веды пра краіну, пра жыццё народа — носьбіта мовы. У сувязі з гэтым, пры адборы мастацкіх тэкстаў неабходна ўлічваць патрабаванні навучэнцаў, іх густы, жаданні. Тэкст павінен быць такім, каб студэнт захацеў яго прачытаць і зразумець. Выкладчык мусіць памятаць, што навучэнец, калі гэта не філолаг, не мае на мэце вывучэнне гісторыі беларускай літаратуры. Таму, пры ўсёй нашай павазе і любові да Ф. Багушэвіча, Я. Купалы ці Я. Коласа, не варта ўключаць іх творы ў навучальны працэс беларускай мовы як замежнай, прынамсі, на элементарным і базавым этапе. Мастацкія тэксты гэтых аўтараў насычаны архаічнай безэквівалентнай сельскагаспадарчай лексікай. Творы сучасных аўтараў, такіх, як А. Федарэнка, У. Сцяпан, Л. Рублеўская і інш. адлюстроўваюць сучасны стан беларускай мовы і сучасную беларускую рэчаіснасць, што ўзмацняе матывацыю чытання. Выкладчык беларускай мовы як замежнай павінен ацаніць літаратурны твор не толькі як факт беларускай культуры, але і з пункту гледжання яго міжкультурнай значнасці; спрагназаваць успрыняцце мастацкага твору замежным навучэнцам; бачыць у выбраным творы навучальны патэнцыял, гэта значыць, у кантэксце практычнага курса беларускай мовы як замежнай; ацэньваць ступень актуальнасці мастацкага твору для пэўных задач навучання і, нарэшце, цярпіма ўспрымаць, тлумачыць эстэтычную, светаўспрымальную пазіцыю навучэнца, якая можа не супадаць з традыцыйнай ці ўласнай выкладчыцкай.

Пры гэтым трэба ясна ўяўляць, якія аўтэнтычныя тэксты можна прапанаваць навучэнцам. Калі тэкст не адпавядае ўзроўню навучэнцаў, яны яго не зразумеюць і будуць падаўлены гэтым. Але навучэнцы бываюць незадаволены і ў тых выпадках, калі сутыкаюцца з лёгкімі тэкстамі. Штучна створаны тэкст можа быць дастаткова эфектыўным сродкам прэзентацыі і адпрацоўкі моўных адзінак, але абсалютна неэфектыўны як сродак развіцця асобы навучэнцаў і арганізацыі натуральнай камунікацыі на занятках. Значыць, у вучэбным працэсе не павінны выкарыстоўвацца крайнія пазіцыі — у дапаможніках неабходныя як аўтэнтычныя, так і неаўтэнтычныя тэксты. Яны павінны быць зразумелыя студэнтам, адпавядаць іх моўнай кампетэнцыі і адлюстроўваць рэальныя мадэлі пісьмовай і гутарковай мовы. Натуральна, добра, калі ёсць магчымасць знайсці аўтэнтычныя матэрыялы, з якімі студэнты маглі б справіцца. Калі такой магчымасці няма, то лепш выкарыстоўваць адаптаваныя тэксты, чым спецыяльна сканструяваныя.

Вельмі добрым аўтэнтычным тэкстам з’яўляецца песня, і аўтарская і народная. Яна стварае ілюзію ўключэння ў асяродак жыцця носьбітаў мовы. Сярод вусных музычных жанраў песня з’яўляецца самым папулярным. Улічваючы характар распаўсюджвання, разнастайную функцыянальнасць, песні часта ўключаюцца ў групу «прагматычных матэрыялаў». Напрыклад, на адных з першых заняткаў з рускамоўнымі навучэнцамі пры вывучэнні тэмы «прошлы час дзеяслова» добра выкарыстоўваць народную песню «Касіў Ясь канюшыну». Яна мае і культуралагічны, і граматычны аспект. Пры вывучэнні творнага склону назоўнікаў навучэнцам прапануецца песня Л. Вольскага «Такога няма нідзе».

Ёсць розныя тыпы аўтэнтычнасці: аўтэнтычнасць матэрыялаў (тэкстаў, вучэбных практыкаванняў), прагматычная аўтэнтычнасць, аўтэнтычнасць сацыяльнай сітуацыі на занятках.

Аднак не існуе адзінай думкі, які тэкст можна лічыць аўтэнтычным у метадычным плане. Гэтая якасць характэрная не проста тэксту, а тэксту ў пэўным кантэксце. Менавіта гэты кантэкст і стварае названыя вышэй тыпы аўтэнтычнасці. Вылучаюць змястоўныя аспекты аўтэнтычнасці вучэбнага тэксту: культуралагічная, інфарматыўная, сітуацыйная, аўтэнтычнасць нацыянальнай ментальнасці, рэактыўная, аўтэнтычнасць афармлення, аўтэнтычнасць вучэбных заданняў да тэкстаў.

Такім чынам, не існуе агульнага азначэння аўтэнтычнасці. Яна ўяўляе сабой сукупнасць шэрагу ўмоваў, розных відаў аўтэнтычнасці. Кожны са складальнікаў заняткаў — тэксты, вучэбныя заданні, абставіны на занятках, вучэбнае ўзаемадзеянне — мае свае крытэрыі, якія дазваляюць адрозніць аўтэнтычнасць ад неаўтэнтычнасці. Задача выкладчыка — дабіцца гарманічнага дапасавання ўсіх параметраў аўтэнтычнасці.

Выйсцем са становішча канфлікту паміж аўтэнтычнасцю і штучнасцю вучэбных матэрыялаў будзе распрацоўка метадычна аўтэнтычных тэкстаў, даступных у моўным плане, і, адначасова, з захаваннем усіх асноўных характарыстык аўтэнтычных тэкстаў, якія вызначаюць іх вучэбную эфектыўнасць.

Як вядома, А. А. Вейзэ належыць завершаная тэорыя адаптавання арыгінальных тэкстаў у навучальных мэтах. Ён лічыць, што скарачэнне арыгінальнага тэксту мае свае межы: калі арыгінальны тэкст вялікага аб'ёму, а перад адаптатарам стаіць задача стварыць ягоны кароткі варыянт для навучальных мэтаў, то за аснову навучальнага неабходна браць не ўвесь арыгінал, а толькі адно з тэкставых меркаванняў, якое перадае дастаткова значную і цікавую інфармацыю. Надаючы вялікае значэнне паступоваму пераходу да чытання арыгінальных тэкстаў, А. А. Вейзэ падкрэслівае неабходнасць рацыянальнай адаптацыі. Адаптацыя разглядаецца як гнуткая з'ява, яе колькасць змяншаецца па меры набыцця навучэнцамі прагрэсіўных навыкаў чытання [2, с. 33].

Спрашчэнне зместу тэксту павінны выяўляцца не ў залішняй адаптацыі, а ў скарачэнні аб'ёму твору і каментаванні складаных для разумення замежніка рэалій. Сапраўды, ці варта марнаваць сілы і час навучэнцаў, каб навучыць і чытаць адаптаваную літаратуру, гэта значыць, літаратуру, якой не існуе ў рэальным функцыянаванні мовы.

Праблемная скіраванасць заняткаў забяспечваецца аўтэнтычнымі тэкстамі з незнаёмымі навучэнцам рэаліямі. Асэнсаванне вядомага і невядомага стварае пэўны псіхалагічны дыскамфорт, матывуе да пошуку правільнай дыферэнцыяцыі аўтэнтычнай інфармацыі. З такіх заняткаў навучэнец выходзіць не толькі з усведамленнем новай інфармацыі, але і ўзброены алгарытмам працы з падобнымі тэкстамі.

Такім чынам, выкарыстанне аўтэнтычных тэкстаў пры навучанні беларускай мове як замежнай садзейнічае фарміраванню камунікатыўнай кампетэнцыі, а менавіта яе складнікаў: маўленчай, сацыякультурнай, моўнай субкампетэнцый. Матывацыйны патэнцыял аўтэнтычных тэкстаў, прымяненне праблемнага метаду навучання дазволяць інтэнсіфікаваць навучальны працэс па беларускай мове як замежнай.

*Літаратура*


1. *Бабинская П. К.* Коммуникативно ориентированное обучение иностранному языку / П. К. Бабинская // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. — Мн., 2010. — № 4. — С. 3–7.
2. *Вейзе А. А.* Чтение, реферирование и аннотирование иностранного текста. / А. А. Вейзе. — М. : Высшая школа, 1985. — 127 с.
3. *Гальперин И. Р.* Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин. — М. : КомКнига, 1980. — 138 с.
4. *Пассов Е. И.* Коммуникативное иноязычное образование: готовим к диалогу культур: Пособие для учителей учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования / Е. И. Пассов. – Минск : Лексис, 2003. – 184 с.
5. *Плотников С. Н.* Книжность как феномен культуры (материалы круглого стола) / С. Н. Плотников // Вопросы философии. — 1994. — № 7–8. – С. 9.
6. *Чумак Л. Н.* Методика преподавания русского языка как иностранного : учеб. пособие / Л. Н. Чумак. — Минск : БГУ, 2009. — 304 с.


*References*


1. Babinskaja P. K. (2010), «Communicative-oriented foreign language training», *Foreign languages in the Republic of Belarus* [«Kommunikativno orientirovannoe obuchenie inostrannomu jazyku», *Zamezhnyja movy u Respublicy Bielarus*], Minsk, vol. 4, pp. 3–7.
2. Vejze A. A. (1985), *Reading, abstracting and annotation of foreign text* [*Chtenie, referirovanie i annotirovanie inostrannogo teksta*], Vysshaja shkola, Moscow, 127 p.
3. Gal'perin I. R. (1980), *Text as an object of linguistic research* [*Tekst kak objekt lingvisticheskogo issledovanija*], KomKniga, Moscow, 138 p.
4. Passov E. I. (2003), *Communicative foreign language education : preparing for the dialogue of cultures* [*Kommunikativnoe inojazychnoe obrazovanie : gotovim k dialogu kul'tur*], Leksis, Minsk, 184 p.
5. Plotnikov, S. N. (1994), «Bookishness as a cultural phenomenon (the round table materials)», *Topics in the study of Philosophy* [«Knizhnost' kak fenomen kul'tury (materialy kruglogo stola)», *Voprosy filosofii*], Moscow, № 7–8, p. 9.
6. Chumak, L. N. (2009), *Methods of teaching Russian as a foreign language : textbook* [*Metodika prepodavanija russkogo jazyka kak inostrannogo : uchebnoe posobie*], BGU, Minsk, 304 p.

**БОРИСЕНКО Ольга Владимировна,**
кандидат филологических наук, доцент кафедры белорусского языка и литературы Минского государственного лингвистического университета; ул. Захарова, 21, г. Минск, 220034, Беларусь; тел. +375293903431, e-mail: olga.volga1964@gmail.com; ORCID ID: 0000-0002-7258-1014

## БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК И КУЛЬТУРА: РАБОТА С ТЕКСТОМ НА УЧЕБНЫХ ЗАНЯТИЯХ

**Аннотация.** ***Цель*** статьи — продемонстрировать методы и приёмы работы с текстом на учебных занятиях по белорусскому языку как иностранному. Главным стимулом чтения для иностранного учащегося является познавательный интерес, желание через белорусскую литературу получить знания о стране, жизни её народа — носителя языка. ***Предметом*** рассмотрения является методика работы с текстом на учебных занятиях по белорусскому языку как иностранному. ***Результатом*** изучения данной проблемы стала разработка концепции преподавания белорусского языка как иностранного, которая имеет коммуникативную направленность обучения. Основной единицей этой концепции является текст. ***Выводы.*** Преподавание языка невозможно без изучения связных текстов. Совершенное владение языком означает умение читать, слушать и понимать аутентичные произведения различных стилей. Именно работа с аутентичными текстами содействует достижению основной цели изучения белорусского языка как иностранного — продуцированию собственных текстов, что означает, формированию спонтанной речи учащихся. Изучая грамматическую тему, учащийся должен понимать перспективу применения её в коммуникации, что и обеспечивает мотивацию учебной деятельности. ***Практическое применение*** результатов исследования видится в оптимизации учебного процесса белорусского языка как иностранного.

**Ключевые слова:** коммуникация, аутентичный и адаптированный текст, белорусский язык, культура, социокультурная компетенция.

**Olga V. BORISENKO,**
Candidate of Philology (PhD), Associate Professor of the Belarusian language and literature Department, Minsk State Linguistic University; 21, Zakharov Str., Minsk, 220034, Belarus,
tel.: +375 293903431; e-mail: olga.volga1964@gmail.com; ORCID ID: 0000-0002-7258-1014

## BELORUSSIAN LANGUAGE AND CULTURE: WORK WITH THE TEXT IN THE CLASSROOM

**Summary.** The ***purpose*** of the article is to demonstrate the methods and techniques of working with a text at the Belorussian as a foreign language classes. The main incentive to reading for a foreign student is his cognitive interest, his desire to gain knowledge about the country, its people (native speakers) life from the Belorussian literature. The ***subject*** of the research is the method of working with a text at the Belorussian as a foreign language classes. The teaching of the Belorussian as a foreign language concept development which is oriented on the communicative training is **the result** of this problem studying. The basic unit of this concept is the text. **Conclusions.** Teaching a language is impossible without connected texts studying. A perfect command of the language is the ability to read, listen to and understand the authentic works of various styles. It is working with authentic texts that promotes the achievement of the main goal of studying Belorussian as a foreign language, videlicet the production of proper texts, which means the formation of spontaneous students speech. Studying a grammatical topic, a student should understand the perspectives of its application in communication that provide motivation for learning activity. **Practical application** of the research results is seen as the Belorussian as a foreign language training process optimization.

**Key words:** communication, authentic and adapted text, belarusian language, culture, socio-cultural competence.

*Статтю отримано 8.10.2016 р.*